**Касцючык В.М.**
(летняя сесія 2019/20 н.г.)

Установа адукацыі
“Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А.С. Пушкіна”
Кафедра беларускай філалогіі

Пытанні <u>да экзамену</u>
па курсе **“Стылістыка і культура беларускага маўлення”**
для студэнтаў **3 курса** спецыяльнасці *“Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць)”*

1. Змест, прадмет і задачы комплекснай дысцыпліны “Стылістыка і культура беларускага маўлення”.
2. Асноўныя катэгорыі і паняцці стылістыкі і культуры маўлення.
3. Гісторыя станаўлення і развіцця стылістыкі і культуры беларускага маўлення.
4. Паняцце функцыянальнага стылю. Стылеўтваральныя фактары. Тыпалагічныя прыкметы функцыянальных стыляў і падстыляў.
5. Афіцыйна-справавы стыль і яго падстылі. Адметнасць моўных сродкаў афіцыйна-справавога стылю.
6. Навуковы стыль і яго падстылі. Лексіка-фразеалагічныя, марфалагічныя, сінтаксічныя асаблівасці навуковых тэкстаў.
7. Публіцыстычны стыль і яго падстылі. Лексіка-фразеалагічныя, марфалагічныя, сінтаксічныя асаблівасці публіцыстычных тэкстаў.
8. Жанры публіцыстычнага стылю.
9. Гутарковы стыль. Тыпалогія жанраў гутарковага стылю. Лексіка-фразеалагічныя, марфалагічныя, сінтаксічныя асаблівасці гутарковых тэкстаў.
10. Мастацкі стыль. Функцыі мастацкага стылю. Тыпалогія жанраў мастацкага стылю.
11. Лексіка-фразеалагічныя, марфалагічныя, сінтаксічныя асаблівасці мастацкіх тэкстаў. Тропы і фігуры. Стылізацыя.
12. Канфесійны стыль. Функцыі, падстылі і жанры канфесійнага стылю. Лексіка-фразеалагічныя, марфалагічныя, сінтаксічныя асаблівасці канфесійных тэкстаў.
13. Фанетычная стылістыка. Сістэма фанастыляў у беларускай мове. Кампаненты фанастылістыкі (маўленчы тон, інтанацыя, эмфатычны націск, якасць артыкуляцыі, даўжыня слова).
14. Функцыянальна-стылістычныя тыпы лексікі: агульнаўжывальная лексіка і лексіка абмежаванага ўжывання. Стылістычна нейтральная і стылістычна афарбаваная лексіка (размоўная, кніжная). Эмацыянальна-экспрэсіўныя тыпы лексікі.
15. Стылістычная характарыстыка запазычанай і ўстарэлай лексікі. Неалагізмы агульнамоўныя і індывідуальна-аўтарскія.
16. Стылістычнае выкарыстанне сінонімаў, перыфраз, амонімаў, паронімаў і антонімаў.

17. Тыповыя памылкі ў словаўжыванні. Недапушчальныя спалучэнні слоў. Ужыванне слова без уліку кантэксту. Памылкі ў стылістычнай ацэнцы слова. Канцылярызмы і моўныя штампы. Плеаназмы і іх віды. Таўталогія. Кантамінацыя.
18. Фразеалагічная стылістыка і яе прадмет. Стылістычныя функцыі фразеалагізмаў. Стылістычныя разрады фразеалагізмаў. Памылкі ў выкарыстанні фразеалагічных сродкаў мовы.
19. Марфалагічная стылістыка і яе прадмет. Стылістычныя рэсурсы назоўніка. Стылістычнае выкарыстанне роду назоўніка. Стылістычныя асаблівасці ўжывання ліку назоўнікаў.
20. Стылістычныя асаблівасці словаўтваральных сродкаў назоўніка.
21. Стылістычныя магчымасці прыметніка. Стылістычныя асаблівасці поўнай і кароткай формаў прыметніка, ступеняў параўнання. Сінанімія прыметнікаў і ўскосных склонаў назоўнікаў.
22. Стылістычныя асаблівасці словаўтваральных сродкаў прыметніка.
23. Асаблівасці стылістычнага выкарыстання займеннікаў розных разрадаў. Тыповыя памылкі ў выкарыстанні займеннікаў.
24. Стылістычныя рэсурсы лічэбніка. Сінанімія колькасна-іменных словазлучэнняў. Тыповыя памылкі ва ўтварэнні і ўжыванні формаў лічэбнікаў.
25. Стылістычныя рэсурсы дзеяслова. Стылістычнае выкарыстанне формаў часу, ладу, трывання дзеяслова. Сінанімія асобных формаў дзеяслова.
26. Стылістычныя рэсурсы службовых часцінаў мовы.
27. Сінтаксічная стылістыка і яе прадмет. Стылістыка словазлучэнняў. Сінанімія канструкцый.
28. Асаблівасці кіравання ў беларускай мове. Кіраванне пры сінанімічных словах. Кіраванне пры аднародных членах сказа.
29. Стылістыка простага сказа. Поўныя і няпоўныя сказы. Экспрэсіўнасць эліптычных канструкцый. Умоўчанне. Аднасастаўныя і двухсастаўныя сказы. Асабовыя і безасабовыя сказы. Намінатыўныя сказы.
30. Аднародныя члены сказа. Лагічныя і граматыка-стылістычныя асаблівасці спалучэння аднародных членаў. Злучнікі і прыназоўнікі пры аднародных членах сказа.
31. Стылістычныя асаблівасці зваротка, пабочных слоў і ўстаўных канструкцый.
32. Адасобленыя члены сказа. Экспрэсіўнае вылучэнне членаў сказа. Адчляненне, далучэнне, анакалуф.
33. Стылістычныя асаблівасці дзеепрыметніка. Сінаніміка дзеепрыметных словазлучэнняў і даданых сказаў. Стылістычныя асаблівасці дзеепрыслоўя. Сінаніміка дзеепрыслоўных словазлучэнняў і даданых сказаў.
34. Складаны сказ. Стылістычнае выкарыстанне розных відаў складаных сказаў. Стылістычныя памылкі ў складаных сказах.
35. Стылістычныя прыёмы ў сінтаксічнай арганізацыі маўлення. Перыяд. Анафара. Эпіфара. Хіязм. Зеўгма. Алюзія. Паралелізм. Страфічнае кальцо. Кампазіцыйны стык. Градацыя. Антытэза. Паўтор. Рытарычнае пытанне. Рытарычны зваротак.
36. Стылістыка тэксту як найважнейшы раздзел стылістыкі маўлення. Асноўныя структурныя адзінкі тэксту.
37. Прынцыпы пабудовы абзацаў: лагічны, эмацыянальнага ці лагічнага падкрэслення; супрацьпастаўлення. Кампазіцыйна-сэнсавы і экспрэсіўна

стылістычны прынцыпы падзелу тэксту на абзацы. Статыстычныя і дынамічныя тыпы абзацаў.

38. Суадноснасць ССЦ і тэксту. Моўна-стылістычныя сродкі ў фармаванні асноўных тыпаў сувязей у ССЦ (пры ланцуговай, паралельнай, далучальнай і змешанай сувязях).
39. Функцыянальна-стылістычныя тыпы маўлення.
40. Тыпы тэкстаў, звязаныя з пазіцыяй вытворцы маўлення. Вобраз аўтара і вобраз апавядальніка.
41. Архітэктанічная функцыя моўных адзінак у мастацкім і публіцыстычным тэксце. Ключавыя словы, моўны лейтматыў, архітэктанічны паўтор.
42. Чужое маўленне і яго стылістычныя функцыі ў розных відах тэкстаў. Маналог, дыялог.
43. Правільнасць як асноўная камунікатыўная якасць маўлення. Арфаэпічныя і акцэнтныя нормы.
44. Арфаграфічныя нормы.
45. Словаўтваральныя нормы.
46. Лексічныя і фразеалагічныя нормы.
47. Марфалагічныя нормы.
48. Сінтаксічныя нормы.
49. Пунктуацыйныя нормы.
50. Тыповыя маўленчыя нестылістычныя памылкі, іх класіфікацыя і спосабы выпраўлення.
51. Дакладнасць маўлення. Тыповыя памылкі, звязаныя з парушэннем дакладнасці, іх класіфікацыя і спосабы выпраўлення.
52. Лагічнасць маўлення як камунікатыўная якасць. Тыповыя памылкі, звязаныя з парушэннем лагічнасці, іх класіфікацыя і спосабы выпраўлення.
53. Багацце (разнастайнасць) маўлення. Роля розных моўных узроўняў у стварэнні багацця і разнастайнасці маўлення.
54. Выразнасць як камунікатыўная якасць маўлення. Моўныя сродкі індывідуальнай выразнасці.
55. Чысціня маўлення. Дыялектная, іншамоўная лексіка, жаргонныя словы, словы-паразіты і чысціня маўлення. Маўленчыя штампы і канцылярызмы.
56. Дарэчнасць маўлення. Віды дарэчнасці: стылявая, кантэкстуальная, сітуацыйная, асобасна-псіхалагічная. Тыповыя памылкі, звязаныя з парушэннем дарэчнасці маўлення, іх выпраўленне.
57. Сціласць (лаканічнасць) маўлення як камунікатыўная якасць маўлення. Недастатковасць маўлення і шматслоўнасць як маўленчыя памылкі, спосабы іх выпраўлення.
58. Пытанні культуры маўлення ў працах Алеся Каўруса.
59. Працы Паўла Сцяцко па словаўтварэнні і культуры беларускага маўлення.
60. Мова і культура маўлення ў падыходах беларускіх пісьменнікаў (Кузьма Чорны, Ян Скрыган, Ніл Гілевіч, Кастусь Цвірка і інш.).